# УМЕННЕ БАЧЫЦЬ ПЕРСПЕКТЫВУ

## Сплаў імкнення працаваць і ўзважаных рашэнняў — аснова высокіх вынікаў

**Галоўнай умовай атрымання высокіх ураджаяў і годных вынікаў у вытворчасці малака ў ААТ «Семежава» лічаць адказны падыход да работы і прафесіяналізм. Гэтыя якасці вызначаюць і лёс ураджаю, і стабільнае развіццё гаспадаркі.**

У мінулым годзе працаўнікі ААТ «Семежава», буйной гаспадаркі Капыльскага раёна, сабралі з кожнага гектара 738 цэнтнераў цукровых буракоў.

— Гэтая культура патрабуе ўвагі і адказнага падыходу, — канстатуе **дырэктар ААТ «Семежава» Юрый ТАРАСЕВІЧ.** — Дарэчы, у раённым спаборніцтве за дасягненне высокіх паказчыкаў па вытворчасці цукровых буракоў мы занялі першае месца.

Юрый Часлававіч — кіраўнік малады, а ўзначаліць яму паўтара года таму прыйшлося вопытны калектыў: сярэдні ўзрост работнікаў ААТ «Семежава» — 50 гадоў. Суразмоўнік падкрэслівае: гэта навучыла яго прадумваць і ўзважваць кожнае рашэнне. А ў цэлым, калі вопыту часам і не хапае, пры падтрымцы высокапрафесійнага калектыву ён хутка напрацоўваецца, дзеліцца дырэктар ААТ «Семежава». Затое маладосць дапамагае глядзець у будучыню і ўмець бачыць перспектыву.



Дырэктар ААТ «Семежава» Юрый ТАРАСЕВІЧ.

### Напрацоўкі і планы

За апошнія паўтара года прадпрыемства паказала дастойныя вынікі.

— Валавы збор збожжавых і зернебабовых у 2023 годзе склаў 11 044 тоны збожжа пры сярэдняй ураджайнасці 49,7 ц/га. Плануем сёлета па вялічыць валавы збор да 117 % да ўзроўню мінулага года з ураджайнасцю, не ніжэйшай за 55 ц/га, — падкрэслівае Юрый Тарасевіч. — Па бульбе летась з 30 га атрымана 1240 тон пры ўраджайнасці 413 ц/га. Вялікая ўвага — кармавой базе. У мінулым годзе было нарыхтавана 552 тоны сена, 21 939 тон сенажу, 24 120 тон сіласу. У гэтым годзе пасеем 1250 га кукурузы, з іх 400 — на зерне.

Па памерах ААТ «Семежава» ўваходзіць у тройку лідараў у сваім раёне, расказвае **галоўны аграном Юрый ЗЯНЬКОВІЧ.** Сельгасугоддзяў у гаспадаркі — 7400 га, з іх 4700 га раллі. Рост ураджайнасці сведчыць аб навуковым падыходзе, тлумачыць ён. Гэта нядзіўна: кіраўнік ААТ «Семежава» па адукацыі аграном, скончыў спачатку Ляхавіцкі аграрны каледж, потым — Горацкую сельскагаспадарчую акадэмію. З яго прыходам у раслінаводстве пачалі прымяняцца сучасныя тэхналогіі, з'явілася новая энерганасычаная сельгастэхніка, правільна выкарыстоўваюцца мінеральныя ўгнаенні. Тандэм сучасных дасягненняў навукі з вопытам працоўнага калектыву дазваляе аграрыям «Семежава» дасягаць стабільна высокіх ураджаяў.



Галоўны аграном Юрый ЗЯНЬКОВІЧ дэманструе зернеачышчальна-сушыльны комплекс.

Найважнейшы кірунак, на якім спецыялізуецца гаспадарка, — малочная жывёлагадоўля. Пагалоўе дойнага статка тут — 1260 жывёл галштынскай пароды, усяго ж буйной рагатай жывёлы — пяць з паловай тысячы. У ААТ «Семежава» тры малочнатаварныя фермы і тры — па адкорме буйной рагатай жывёлы.

— Дзякуючы жывёлаводам нашай гаспадаркі валавы надой малака за 2023 год склаў 9233 тоны, або 106 %, да 2022 года. Сярэдні надой ад адной каровы дасягнуў 7425 кг, — адзначае Юрый Тарасевіч.

Высокія надоі забяспечваюцца ў першую чаргу якаснымі рацыёнамі. Уласнымі кармамі свой немаленькі статак гаспадарка забяспечвае цалкам. Якасныя кармы кіраўнік лічыць першачарговай задачай — не менш за 27 цэнтнераў кармавых адзінак на кожную ўмоўную галаву.

— Камбікорм вырабляем самі, а рацыёны распрацоўваем у тым ліку з дапамогай навуковых арганізацый. Змянілі рацыёны жывёл, насыцілі канцэнтраты бялком, — дзеліцца кіраўнік.

Як вынік, за суткі тут дояць 20 літраў малака з каровы, 80 % — сортам «экстра».

— Надоі ў нас вышэйшыя, чым у сярэднім па Капыльскім раёне, — адзначае **галоўны заатэхнік ААТ «Семежава» Таццяна ГАРБАЦЭВІЧ.** — Пастаянна робім аналіз кармоў, балансуем рацыёны, змешваючы інгрэдыенты ў патрэбных прапорцыях. Акрамя таго, мы актыўна ўключыліся ў праграму галштынізацыі, якая ідзе ў краіне. І сёння ўвесь дойны статак у нас — галштыны. Гэта станоўча ўплывае і на колькасць, і на якасць малака.

Летась закуплена 1353 галавы маладняку буйной рагатай жывёлы для адкорму, расказвае спецыяліст. Вырашчана 1055 тон мяса. Сярэднясутачнае прыбаўленне ў вазе па гаспадарцы складае 660 г, але на некаторых участках гэты паказчык дасягае 710 г.



Галоўны заатэхнік Таццяна ГАРБАЦЭВІЧ з загадчыкам МТФ № 3 Віктарам СЯРГЕЙЧЫКАМ паказваюць памяшканне, дзе будуць размяшчацца цяляты.

### Інвестыцыі ў заўтрашні дзень

Сёння ААТ «Семежава» нагадвае будаўнічую пляцоўку. Многае будуецца цяпер, сёе-тое ўжо пабудавана. Першай ластаўкай стаў новы зернесушыльны комплекс КЗС, запушчаны пазалетась. Сёння завяршаецца будаўніцтва малочнатаварнага комплексу на 800 галоў. Праект уключае два кароўнікі, а таксама даільна-малочны блок. Маштабная будоўля будзе завершана ўжо ў сакавіку. Гэта дазволіць закрыць дзве маральна састарэлыя фермы, якія дасталіся «ў спадчыну» цяперашняму кіраўніку і дзе жывёлы знаходзяцца на прывязным утрыманні.



Механізатар Сяргей ГАРДЗЕЙ займаецца рамонтнымі работамі сеялак.

— У планах — пабудаваць таксама памяшканні для сухастою і раздою, — кажа аб найбліжэйшых перспектывах кіраўнік. — Дабудоўваем прафілакторый для цялят на 300 галоў, каб цялятKі ад нуля і да трох месяцаў знаходзіліся ў цёплым памяшканні, пад дахам. Гэта не навіна па краіне, але ў нашай гаспадарцы раней такога не было.



Адбываюцца работы па ўдабрэнні зямлі каля аграгарадка Семежава.

**Загадчык МТФ № 3 Віктар СЯРГЕЙЧЫК** паказвае амаль гатовы будынак прафілакторыя.

— Засталіся апошнія работы, у сакавіку аб'ект будзе ўведзены ў эксплуатацыю, — кажа ён.

І дадае, што на 300 цялят у новым будынку дастаткова траіх супрацоўнікаў, таму што комплекс будзе мець сучаснае начынне.

— Праектам прадугледжана малочнае таксі — абсталяванне для развозу малака цялятам, — тлумачыць суразмоўнік.

Здароўе маладняку — не адзіны плюс прафілакторыя для цялят. Бо і людзі будуць працаваць пад дахам, а не на вуліцы. А гэта вельмі каштоўна, асабліва ў маразы.

Развіццё тэхнічнага парка — яшчэ адзін неабходны ўнёсак у будучыню.

— З тэхнікі закупілі за паўтара года тры новыя збожжаўборачныя камбайны, адзін кормаўборачны камбайн, новы энерганасычаны трактар «Кіравец», тры маленькія трактары, — пералічвае дырэктар. — Набылі сучаснае прычапное абсталяванне для ўнясення ўгнаенняў і кормараздатчыкі на фермы.

Гэтымі зімовымі днямі ў «Семежаве» на поўную моц ідзе падрыхтоўка да новага сельгассезона. Закупляюцца сродкі ахову раслін, мінеральныя ўгнаенні і, вядома, прыводзіцца ў парадак аўтапарк, каб ва ўзбраенні выйсці на вясновыя палявыя работы.

— На дадзены момант адрамантавана практычна ўся пасяўная і глебаапрацоўчая тэхніка, — распавядае **вядучы інжынер Міхаіл ГОЛЕЦ.**

### Залаты фонд — людзі

Сфера адказнасці Юрыя Тарасевіча — 240 работнікаў ААТ «Семежава». Для іх — сацыяльныя гарантыі, добрыя ўмовы працы, жыллё пры неабходнасці і, вядома, у першую чаргу — стабільная і дастойная зарплата.

— Імкнёмся трымаць стабільны ўзровень заработнай платы. Яе рост у мінулым годзе склаў больш за 20 % да ўзроўню года пазамінулага. Удалося захаваць інфраструктуру аграгарадка — ёсць школа, бальніца. Тым, хто мае такую патрэбу, выдзяляецца дом або кватэра. Выдаткоўваем прэміі да ўсіх значных свят, — кажа кіраўнік.

Не забыты і вольны час работнікаў. Нягледзячы на салідны сярэдні ўзрост, калектыў ААТ «Семежава» рэгулярна ўзыходзіць на п'едэстал гонару раённай спартакіяды, а ў мінулым годзе каманда на чале з дырэктарам заняла 1-е месца.

Восень 2023-га запомнілася жыхарам аграгарадка Семежава тым, што гаспадарка прымала раённыя «Дажынкі». Гасцей свята парадавалі атракцыёны, канцэрт і нават феерверк. Бо ў ААТ «Семежава» любую справу прывыклі арганізоўваць якасна і адказна.

УНП 600018573 **Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ, Алена ДАЎЖАНОК. Фота Кацярыны УРБАН.**

Культура

# КРЫНІЦА ВЕДАЎ

## У юных жыхароў Капыля не ўзнікае пытання, навошта хадзіць у бібліятэку

**У Мінскай вобласці — асаблівае стаўленне да сацыяльных праектаў. І адно з пацвярджэнняў таму — дзіцячая бібліятэка, якая адкрылася ў 2021 годзе ў Капылі. За тры гады яе высокапрафесійны калектыў здолеў зрабіць дзіцячую бібліятэку цэнтрам прыцягнення як юных гараджан, так і іх бацькоў.**

Новы будынак дзіцячай бібліятэкі стаў падарункам капылянам на Дажынкі і Дзень пісьменства. А раней 16 гадоў працавала дзіцячая бібліятэка ў чытальнай зале Капыльскай раённай цэнтральнай бібліятэкі імя Анатоля Астрэйкі. Зразумела, было гэта нязручна: не хапала месца, каб змясціць фонды (у дзіцячай бібліятэцы Капыля яны складаюць больш за 30 тысяч кніг). Сёння ў распараджэнні маленькіх чытачоў, падлеткаў і старшакласнікаў — цэлы будынак. Утульная і пры гэтым прасторная чытальная зала падзелена на зоны, каб тут было камфортна і маленькім аматарам кніг, і старэйшым дзецям. З улікам спецыфікі чытацкай аўдыторыі размяшчаюцца кнігі і на стэлажах: для малых — ніжэй, для падлеткаў і старшакласнікаў — на больш высокіх паліцах. Дацягнуцца да ведаў могуць усе!

— Сёння ў юных чытачоў запатрабаваны аўтары, якія выдаваліся ў 1970—1980-я гады, — расказвае **Валянціна КАМІНСКАЯ, загадчыца дзіцячай бібліятэкі Капыля.** — Яны ўключаны ў школьную праграму. Гэта і Максім Лужанін, і Юрась Свірка, і Пятро Рунец, і Уладзімір Карызна, і Валянцін Лукша, і Міхаіл Пазнякоў. У падлеткаў запатрабаваны Янка Маўр, Іван Навуменка. З рускай літаратуры цікавяцца Гайдарам — як ні дзіўна, сучасным дзецям зразумела тое, пра што ён піша. І, зноў жа, гэты аўтар ёсць у школьнай праграме.



Загадчыца Капыльскай дзіцячай бібліятэкі Валянціна КАМІНСКАЯ.

Па-за праграмай карыстаюцца цікавасцю маленькіх чытачоў, напрыклад кнігі Таццяны Аляксандравай пра дамавіка Кузю. Падлеткам цікавыя кнігі Ліны Багданавай (серыя «Тусоўка»), актыўна чытаюць яны таксама беларускае і расійскае фэнтэзі.

— У старшакласнікаў нязменны хіт — кнігі Асі Лаўрыновіч, — дадае суразмоўніца. — Гэта малады расійскі аўтар, і з цяперашнімі 16—18-гадовымі яна на адной хвалі. Але, што самае цікавае, гэтага аўтара з задавальненнем чытаюць і бабулі!

Будынак дзіцячай бібліятэкі знаходзіцца ў самым пачатку вуліцы Цімкавіцкай, у густанаселеным мікрараёне Капыля. Ведаючы гэта, супрацоўнікі яшчэ да наваселля сталі фарміраваць і дарослы фонд. І сёння, гавораць яны, у іх пачалі чытаць нават тыя мамы і таты, дзядулі і бабулі, якія раней ніколі не сябравалі з літаратурай: прыводзяць дзяцей і самі адчуваюць цікавасць да кніг.




Тэматычная выстава кніг, прысвечаная дню памяці юнага героя-антыфашыста.

Для гэтага ў бібліятэкараў ёсць свае прыёмы. Напрыклад, кніжныя міні-выставы — тэматычныя, з новымі паступленнямі, мерапрыемствы да юбілеяў пісьменнікаў і адукацыйныя сустрэчы для чытачоў.

— Напрыклад, у нас прайшла адукацыйная віктарына «Дзецям аб законе» для чацвёртых класаў. Школьнікі з задавальненнем прымалі ў ёй удзел, — дзеліцца загадчыца дзіцячай бібліятэкі. — Цяпер яны разумеюць: і ў дарослых, і ў дзяцей ёсць не толькі правы перад законам, але і абавязкі. І гэта дапаможа ім вырасці дастойнымі грамадзянамі сваёй краіны.

**Дзіяна РОНІНА.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**


## РУП «ТОРГОВЫЙ ДОМ «ВОСТОЧНЫЙ»

извещает о проведении 03.04.2024 открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства

**Лот № 1.** Земельный участок с кадастровым номером 623680600004000090 (целевое назначение – садоводство в садоводческом товариществе «Аэрогеодезист») площадью 0,0253 га, расположен по адресу: Минская обл., Минский р-н, Боровлянский с/с, СТ «Аэрогеодезист», 18А. **Начальная цена продажи – 42 210,00 бел. руб., задаток – 4 221,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.** Ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные на природных территориях, подлежащих специальной охране (в зоне санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения), водозабор «Новинки» 3-й пояс, площадь – 0,0253 га. Ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в зонах ограничений в пределах территорий перспективного развития населенных пунктов (г. Минск), площадь – 0,0253 га.

**Лот № 2.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-7056443 площадью 17,3 кв. м, назначение – административное помещение, наименование – административное помещение, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, д. 25, пом. 5. **Начальная цена продажи – 26 632,80 бел. руб., задаток – 2 663,28 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.** Постановлением инспекции Министерства по налогам и сборам Республики Беларусь по Октябрьскому району г. Минска от 26.07.2023 № 004582 наложен арест на имущество.

**Лот № 3.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-7056445 площадью 17,3 кв. м, назначение – административное помещение, наименование – административное помещение, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, д. 25, пом. 7. **Начальная цена продажи – 26 632,80 бел. руб., задаток – 2 663,28 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.** Постановлением инспекции Министерства по налогам и сборам Республики Беларусь по Октябрьскому району г. Минска от 26.07.2023 № 004582 наложен арест на имущество.

**Лот № 4.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-7056446 площадью 17,1 кв. м, назначение – административное помещение, наименование – административное помещение, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, д. 25, пом. 8. **Начальная цена продажи – 26 341,20 бел. руб., задаток – 2 634,12 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.** Постановлением инспекции Министерства по налогам и сборам Республики Беларусь по Октябрьскому району г. Минска от 26.07.2023 № 004582 наложен арест на имущество.

**Лот № 5.** Изолированное помещение с инвентарным номером 100/D-140366, площадью 15,0 кв. м (назначение: машино-место, наименование: машино-место № 31, находящееся в капитальном строении с инвентарным номером 100/C-93046 (подземная автопарковка), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 140100000001032090 площадью 0,5087 га. Адрес: г. Брест, ул. Воровского, 31А-31. Год постройки – 2018. **Начальная цена продажи – 8 586,00 бел. руб., задаток – 858,60 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.** Постановлением инспекции Министерства по налогам и сборам Республики Беларусь по Советскому району г. Гомеля от 05.09.2023 № 000013 наложен арест на имущество.

**Лот № 6.** 1/2 доли в праве собственности на земельный участок с кадастровым номером 623686605101000501 (назначение – земельный участок для ведения личного подсобного хозяйства) площадью 0,502 га, расположен по адресу: Минская обл., Минский р-н, Сеницкий с/с, д. Сеница. **Начальная цена продажи – 126 000,00 бел. руб., задаток – 12 600,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 7.** Объект недвижимости: 1/2 доли в праве собственности на капитальное строение с инвентарным номером 442/C-3831 (назначение – здание одноквартирного жилого дома, наименование – одноэтажный бревенчатый жилой дом с жилой пристройкой бревенчатой, общей площадью 70,1 кв. м, с составными частями и принадлежностями: две веранды дощатые, сарай бревенчатый, сарай дощатый, уборная дощатая, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 424655100001000951 по адресу: Гродненская обл., Островецкий р-н, г. Островец, ул. Заречная, 13). **Начальная цена продажи – 19 584,00 бел. руб., задаток – 1 958,40 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 8.** Земельный участок с кадастровым номером 623881700034000105, площадь 0,0676 га, назначение – земельный участок для ведения коллективного садоводства, расположенный по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, Красненский с/с, садоводческое товарищество «Монолит-92», У-109. **Начальная цена продажи – 2 967,64 бел. руб., задаток – 296,76 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.** Постановлением следователя отдела по Гомельской области Главного управления по расследованию преступлений в сфере организованной преступности и коррупции Следственного комитета Республики Беларусь от 20.04.2017 № б/н наложен арест на имущество.

**Лот № 9.** Земельный участок с кадастровым номером 623883000043000051, площадь 0,102 га, назначение – земельный участок для ведения коллективного садоводства, расположенный по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, Олехновичский с/с, СТ «Ветеран-7», У-68. **Начальная цена продажи – 6 619,80 бел. руб., задаток – 661,98 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.** Постановлением следователя Ленинского (г. Минска) районного отдела Следственного комитета Республики Беларусь от 28.02.2018 № б/н наложен арест на имущество.

**Лот № 10.** Капитальное строение, инвентарный номер 700/C-48324, назначение – здание специализированное для общественного питания, наименование – здание столовой, расположено по адресу: г. Могилев, ул. Кутепова, д. 28А. Двухэтажное каменное здание столовой, год постройки (дата приемки в эксплуатацию) – 1980, общая площадь здания – 869,4 кв. м; право хозяйственного ведения: РТУП «Белорусское речное пароходство», УНП 400071046. Расположено на земельном участке с кадастровым номером №740100000005005425, площадь 0,2158 га, целевое назначение – земельный участок для обслуживания здания столовой. **Начальная цена продажи – 173 520,00 бел. руб., задаток – 17 352, 00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.** Постановлением о наложении ареста на имущество и (или) изъятии имущества плательщика налогов, сборов (пошлин) (залогодателя, поручителя) инспекции Министерства по налогам и сборам Республики Беларусь по Центральному району г. Гомеля от 16.01.2023 № 2-3-1 наложен арест на имущество.

**УСЛОВИЯ**

1. Победитель аукциона либо в случае если заявление на участие в аукционе подано только одним участником, и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) процентов (далее – Претендент на покупку), не позднее 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона на основании счета-фактуры возмещает затраты на организацию и проведение аукциона и оплачивает стоимость приобретенного объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

2. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для победителя аукциона. Организация и проведение аукциона осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

3. Порядок проведения аукциона, в том числе об оформлении участия в аукционе, указан на сайте konfiskat.by в разделе «Недвижимость».

**Аукцион состоится 03.04.2024 в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Уручская, 27, актовый зал.**

Заявление на участие с приложением необходимых документов, в том числе документа, подтверждающего внесение суммы задатка (задатков) **с отметкой банка,** принимаются по адресу: г. Минск, ул. Уручская, 27 в рабочие дни: пн.– чт. – с 09.00 до 13.00, с 14.00 до 17.00, пт. – с 09.00 до 13.00, с 14.00 до 15.00. **Окончание приема заявлений – 29.03.2024 в 15.00.**

Задаток перечисляется на расчетный банковский счет Организатора аукциона: р/с BY53 AKBB 3012 0134 7111 1530 0000, БИК AKBBBY2X, ОАО «АСБ Беларусбанк» ЦБУ № 514, г. Минск, ул. Сурганова, 47а, получатель – РУП «Торговый дом «Восточный», УНП 101127633, ОКПО 37411910. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже капитального строения (изолированного помещения), Лот №___, проводимом 3 апреля 2024 года.

**Лот может быть снят с аукциона Организатором по письменному указанию Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь в любое время до объявления его проданным.**

**Контакты организатора аукциона: +375 44 763 62 63; +375 17 395 95 21.**